6

КАСТРЫЧНІКА
2010 г.
СЕРАДА
№ 37 (15640)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

НОВЫЯ ЗВЕСТКІ ПРА ЧАЛАВЕКА

ЎДАЛОСЯ АТРЫМАЦЬ НА «ТЭАТРАЛЬНЫМ КУФРЫ-2010»

Часам чалавеку для таго, каб выказаць уласныя эмоцыі, не хапае палітры жэстаў, нестае пластыкі, мімікі, мноства нейкіх прадметаў. Але вось 7-ы Міжнародны фестываль студэнцкіх тэатраў у Мінску паказаў, што для таго, каб выказаць свае эмоцыі, цалкам дастаткова ўласнага цела і чорнай драўлянай скрыні, вагой недзе ў 10 кілаграмаў... «Тэатральны куфар» — гэта магчымасць пабачыць тэатральныя тэндэнцыі з усяго свету. Пра тое, што такое студэнцкі тэатр і для чаго ён патрэбны, я разважала цэлы фестывальны тыдзень.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Сцэна са спектакля «Чырвоны пакой».

«ГОЛЫ» РЭЗАНАНС

«О, не! Тры голыя мужчыны на сцэне цягам гадзіны — гэта не тое, што я магу вынесці!» — найбольш распаўсюджаная рэпліка, якую даводзілася чуць пасля спектакля «Дрэнныя людзі ў Гуантанама», які паказаў тэатр Рымскай тэатральнай акадэміі «Sofia Amendolea». Спектакль выклікаў пачуцці самыя змешаныя... Напэўна, ён і ёсць той самы шакіруючы спектакль фестывалю. Наогул, ён у пэўным сэнсе ўнікальны, бо прадстаўляе сацыяльна-палітычную тэатральную плынь, якая абсалютна не развіваецца ў Беларусі. Італьянскі спектакль распавядае пра тое, як амерыканскія вайскоўцы здзекаваліся з іракскіх ваеннапалонных у турме Абу-Грэйб. Пастаноўка базуецца на рэальных падзеях. У 2004 годзе сусветная грамадскасць убачыла фотаздымкі фізічных, псіхалагічных і сэксуальных здзекаў з распранутых вязняў іракскай турмы. «Дрэнныя людзі ў Гуантанама» — спроба па-свойму асэнсаваць гэты страшны гвалт з чалавека. І не кажыце цяпер, што тэатр — гэта неактуальна. Агіда, роспач, грэблівасць, шкадаванне і шмат яшчэ якія апакаліптычныя пачуцці апаноўвалі мяне падчас прагляду. Але адначасова думалася і пра тое, што драматычна паставіць спектакль пра здзекі з чалавека, пра жахі вайны альбо смерць дзіцяці значна лягчэй, чым нейкую бергманаўскую псіхалагічную сітуацыю з жыцця...

На студэнцкім фестывалі было ўсё па-дарасламу. Сапраўдныя цыгарэты на сцэне, віно, булачкі, мандарыны, натуралістычныя сцэны інтымнай блізкасці і фізічных здзекаў. Сапраўдная «Імітацыя жыцця». Дарэчы, менавіта так і называўся сербскі спектакль, за галоўную ролю ў якім Мар'яна Дардэвіч атрымала прыз. Лёгкая сучасная камедыя для мужчын, якая распавядае пра патаемныя справы людзей. Маці, хаваючыся ад сына, зарабляе грошы віртуальным сэксам. Сяброўка сына працуе разам з яго маці, але сын пра гэта таксама не ведае. У канцы, безумоўна, усе пра ўсё даведваюцца і робяць свае высновы... Цікава яшчэ адзначыць, што найноўшыя тэхналогіі актыўна пранікаюць у тэатр. І не толькі ў выглядзе відэапраекцый на сцэну (як у спектаклях «Апошні Гадо» і «Жанчыны Бергмана»), але і ў выглядзе сучасных сюжэтаў з сучаснымі героямі, якія маюць мабільныя тэлефоны, ноўтбукі і вэб-камеры (як у спектаклі «Імітацыя жыцця»). Такія смелыя гісторыі ў тэатры беларусы могуць пабачыць хіба што на замежных пастаноўках.

ЦЕЛА І ДУША

Спектаклі, якія паказваліся на фестывалі, сапраўды ўразілі сваёй стракатасцю. Фрывольныя камедыі разам з палітычнымі і філасофскімі п'есамі стварылі атмасферу абсалютнай дэмакратыі і пацвердзілі некан'юнктурную сумленную рэпутацыю «Тэатральнага куфра». Беларусы сапраўды могуць ганарыцца тым, што маюць такі ўнікальны тэатральны форум: студэнцкі, але вельмі сур'ёзны.

«Арто Гулец» — адно з самых моцных уражанняў фестывалю. Гасцявы спектакль Дэяна Андрыча з Босніі і Герцагавіны распавядае пра апошнія моманты жыцця славутага француза Антанена Арто. Вы, напэўна, падумалі, што гэта тэатральнае радно з мноствам персанажаў і дэкарацый. Але насамрэч спектакль мае самую мінімалістычную сцэнаграфію, якую толькі можна сабе ўявіць. Нічога лішняга, нічога не перашкаджае аўтару і выканаўцу прадэманстраваць сваё голае майстэрства. На сцэне толькі ён адзін і чорная драўляная скрыня, якая сімвалізуе то смерць, з якой персанаж не можа справіцца; то мастацтва, якое бязлітасна яго пераследуе, і акцёр адбіваецца ад чорнай скрыні ў гіперрэалістычных канвульсіях. «Арто Гулец» — гэта шыкоўны монаспектакль, дзе Дэяну Андрычу пры дапамозе сваёй выдатнай мімікі, пластыкі і чалавечай шчырасці ўдалося паказаць пакуты творчасці, згрызоты сумлення, страх, роспач і надзею. Адным словам, мовай цела прадэманстраваць усе душэўныя зрухі, якія адбываюцца з чалавекам. А гэта дарагога вартае.

Яшчэ адным натуралістычным спектаклем, які атрымаў адразу дзве ўзнагароды — прыз міжнароднага прафесійнага журы за найлепшую рэжысуру і Гран-пры глядацкіх сімпатый, — стаў «Чырвоны пакой» тэатра «The Remington project» брытанскага ўніверсітэта Бат Спа. «Чырвоны пакой» — гэта своеасаблівы рымэйк казкі пра «Сінюю бараду», якую ўсе мы памятаем з дзяцінства. Але для таго, каб паказаць сваё майстэрства, рэжысёру і акцёрам зусім не патрэбна мудрагелістая гісторыя. Тэатр размаўляе з намі на мове простых людзей, на мове жэстаў і цела, якая зразумелая кожнаму. Брытанцы прывезлі сапраўдны моладзевы спектакль, які сабраў поўную залу і выклікаў абсалютнае захапленне ў беларускай публікі сваёй смеласцю, сучаснасцю і якасцю: у ім музыка вядомага аўстралійца Ніка Кэйва, выдатныя харэаграфічныя і вакальныя нумары, дынаміка і душэўнасць. Думаю, «Чырвоны пакой» мог бы паспяхова ісці ў любым беларускім тэатры.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

ТРЫ «РЭПЕТЫЦЫІ» ЦТ ПАВЫШАЮЦЬ ШАНЦЫ НА ПОСПЕХ

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ВЫНІКІ цэнтралізаванага тэсціравання гэтага года сур'ёзна азадачылі і школьных педагогаў, і кіраўнікоў адукацыйнай галіны, і членаў Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам уступных іспытаў. Колькасць абітурыентаў, якія набіраюць на ЦТ нізкія балы, працягвае павялічвацца. У 2010 годзе сярэднія балы па прадметах аказаліся ніжэйшымі прыкладна на 2,5 адзінкі ў параўнанні з мінулагоднімі, за выключэннем геаграфіі, гісторыі Беларусі і грамадазнаўства. Асабліва сумная сітуацыя склалася на ЦТ з дакладнымі навукамі.

ПАРАЎНАЛЬНАЯ ТАБЛІЦА СЯРЭДНЯГА БАЛА АБІТУРЫЕНТАЎ 2010 ГОДА ПА ВЫНІКАХ ЦТ

Прадмет	Сярэдні бал выпускнікоў агульнаадукацыйных устаноў 2010 г.	Сярэдні бал усіх удзельнікаў ЦТ
Руская мова	46.82	31.37
Беларуская мова	44.79	31.28
Фізіка	28.13	18.09
Матэматыка	35.13	21.76
Хімія	44.22	32.71
Біялогія	44.02	34.39
Англійская мова	42.89	29.63
Нямецкая мова	42.31	28.3
Іспанская мова	55.55	33.44
Французская мова	45.84	31.09
Гісторыя Беларусі	44.74	35.03
Грамадазнаўства	47.35	37.2
Геаграфія	45.09	36.45
Сусветная гісторыя навейшага часу	47.46	36.66

Сёлетнія выпускнікі агульнаадукацыйных устаноў склалі толькі 42 працэнты ў агульным патоку абітурыентаў узору 2010 года.

ПУНКТЫ РЭГІСТРАЦЫІ ДЛЯ ЎДЗЕЛУ Ў РЭПЕТЫЦЫЙНЫМ ТЭСЦІРАВАННІ

г. Мінск

Установа адукацыі	Месца размяшчэння пункта рэгістрацыі, тэлефон
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт	г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 4, к.116, тэл.: 209 54 06
Ліцэй БДУ	г. Мінск, вул. Ульянаўская, 8, тэл.: 226 00 62
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі	г. Мінск, вул. Гікала, 9, к. 422, тэл.: 293 80 40
Міжнародны дзяржаўны экалагічны ўніверсітэт імя А. Д. Сахарава	г. Мінск, вул. Даўгабродская, 23, к. 107, тэл.: 230 73 72
Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт	г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 99, корп 2, к. 321, 323, ,326 тэл.: 267 05 92, 267 72 68
Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка	г. Мінск, вул. Савецкая, 18, тэл.: 200 94 17
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт	г. Мінск, ул. Свярдлова, 13а, тэл.: 227 73 89

Мінская вобласць

Установа адукацыі	Месца размяшчэння пункта рэгістрацыі, тэлефон
Мінскі дзяржаўны абласны ліцэй	г. Мінск, вул. Сярова, 18, тэл.: 275 24 94
Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі	г. Мінск, ул. П. Глебкі, 88, тэл.: 255 44 27
Аддзел адукацыі Барысаўскага райвыканкама	г. Барысаў, вул. Арджанікідзэ, 9, тэл.: 8 (0177) 76 22 11, 76 20 65
Аддзел адукацыі Маладзечанскага райвыканкама	г. Маладзечна, вул. Маркава, 14, тэл.: 8 (0176) 77 08 97
Аддзел адукацыі Салігорскага райвыканкама	г. Салігорск, вул. Казлова, 35, тэл.: 8 (01742) 22 16 82

Брэсцкая вобласць

Установа адукацыі	Месца размяшчэння пункта рэгістрацыі, тэлефон
Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт	г. Брэст, вул. Маскоўская, 267, тэл.: 8 (0162) 42 70 11, маб.: 8 (033) 606 66 16

Віцебская вобласць

Установа адукацыі	Месца размяшчэння пункта рэгістрацыі, тэлефон
Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт	г. Віцебск, пр-т Маскоўскі, 72, тэл.: 8 (0212) 47 72 34
Аддзел адукацыі Аршанскага гарадскога выканкама	г. Орша, вул. Замковая, д.11 тэл.: 8 (0216) 21 33 04

Гродзенская вобласць

Установа адукацыі	Месца размяшчэння пункта рэгістрацыі, тэлефон
Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы	г. Гродна, вул. Кастрычніцкая, 5, аўд. 102, 106, тэл.: 8 (0152) 73 01 01 (шматканальны), 74 14 86

Гомельская вобласць

Установа адукацыі	Месца размяшчэння пункта рэгістрацыі, тэлефон
Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П.Сухога	г. Гомель, пр-т Кастрычніка, 48, тэл.: 8 (0232) 47 52 74

Магілёўская вобласць

Установа адукацыі	Месца размяшчэння пункта рэгістрацыі, тэлефон
Беларуска-Расійскі ўніверсітэт	г. Магілёў, пр-т Міра, 43, аўд. 221, тэл.: 8 (0222) 25 36 03

Нагадаем, што сярэдні бал удзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання па матэматыцы склаў сёлета 21,76 бала, а па фізіцы — 18,1 бала. 20 балаў і менш атрымалі 72,9 працэнта ўдзельнікаў ЦТ па фізіцы, а па матэматыцы на 20 балаў і менш напісалі тэставую работу 62,4 працэнта абітурыентаў. Максімальная колькасць нулявых вынікаў таксама была зарэгістраваная па гэтых дысцыплінах: 450 нулявых вынікаў па матэматыцы і 104 — па фізіцы. **Старшыня Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў у ВНУ і ССНУ ў 2010 годзе Анатоль РУБІНАЎ** прызнаўся журналістам, што члены камісіі спрабавалі ўстанавіць прычыны такога становішча. Можа быць, тэсты былі празмерна складаныя ці формула падліку балаў у Беларусі недасканалая? На думку незалежных экспертаў, тых жа рэпетытараў, якія з'яўляюцца незацікаўленымі асобамі, тэсты не былі звышскладанымі, і змест заданняў не выходзіў за рамкі школьнай праграмы. Аналізу падвергліся таксама і сістэмы падліку балаў, што выкарыстоўваюцца пры правядзенні тэсціравання ў іншых краінах. Высветлілася, што наша сістэма — не горшая. Значыць, прычыну зніжэння балаў на ЦТ трэба шукаць у падрыхтоўцы прэтэндэнтаў на студэнцкі білет. У гэтым годзе ў ЦТ удзельнічалі 173,5 тысячы чалавек, а са школ пайшлі ў дарослае жыццё 88 тысяч выпускнікоў. Выходзіць, што большая палова абітурыентаў закончылі школы ў папярэднія гады. Можна меркаваць, што не ўсе з іх добра падрыхтаваліся. Акрамя таго, многія былі першапачаткова нацэленыя на платную форму навучання. Такім чынам, як ні круці, але выходзіць, што вынікі цэнтралізаванага тэсціравання з'яўляюцца рэальнай ацэнкай узроўню падрыхтоўкі сёлетніх абітурыентаў.

На думку **дырэктара Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалая ФЯСЬКОВА**, дастаткова вялікая колькасць выпадковых людзей на тэсціраванні — гэта вынік даступнасці і зручнасці здачы экзаменаў у тэставай форме, калі абітурыент пазбаўлены асабістага кантакту з экзаменатарамі. Адна рэч — паставіць наўдачу адказы ў тэстах, і зусім іншая — зняславіць сябе перад экзаменацыйнай камісіяй. Калі яшчэ 20 гадоў таму на вышэйшую адукацыю адважваліся замахнуцца толькі 25-30 працэнтаў выпускнікоў агульнаадукацыйных школ, то цяпер усе масава ідуць удзельнічаць у тэсціраванні. У 2009 годзе, напрыклад, удзел у ЦТ узялі 92 працэнты выпускнікоў школ, а сёлета — 82 працэнты. Аднак агульная колькасць абітурыентаў істотна не змяняецца ў Беларусі чатыры апошнія гады. Да выпускнікоў гэтага года далучаюцца выпускнікі папярэдніх гадоў, выпускнікі прафесійна-тэхнічных і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, а таксама прэтэндэнты на атрыманне другой вышэйшай адукацыі.

Тэставыя балы азначаюць рэйтынгавае месца канкрэтнага чалавека ў агульным патоку абітурыентаў. Галоўным з'яўляецца не абсалютны вынік, а перавага абітурыента перад іншымі прэтэндэнтамі на студэнцкі білет.

Па словах Мікалая Фяськова, балы, якія абітурыенты атрымліваюць на ЦТ, не могуць дублёваць школьную адзнаку. Тэставыя балы азначаюць рэйтынгавае месца канкрэтнага чалавека ў агульным патоку абітурыентаў. Галоўным з'яўляецца не абсалютны вынік, а перавага абітурыента перад іншымі прэтэндэнтамі на студэнцкі білет.

Праўда, самалюбства ўладальнікаў школьных «васьмёрак» і «дзявятак», якія аказваюцца ў ніжняй частцы 100-бальнай тэставай шкалы, моцна церпіць, як і прафесійнае самалюбства іх педагогаў. Некаторыя нават падазраюць арганізатараў у тэхнічных збоях пры праверцы работ удзельнікаў ЦТ. Супрацоўнікам Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў неаднойчы даводзілася разбірацца з такімі скаргамі...

— Хачу паведаміць, што чарнавікі ўдзельнікаў ЦТ часта служаць для нас дадатковай крыніцай інфармацыі, з дапамогай якой мы можам скласці ўражанне пра чалавека, які прыходзіў да нас на тэсціраванне, — прызнаецца Мікалай Фяськоў. — Калі нам здаюць абсалютна чысты бланк адказаў і на чарнавіку не назіраецца ніякіх запісаў, то можна зрабіць выснову, што гэта быў выпадковы чалавек, які, напэўна, спадзяваўся або на цуд, або здаўся пад націскам бацькоў, прыйшоўшы на экзамен. Тым не менш і яго вынік уплывае на агульную статыстыку. Увогуле мы заўважылі, што прыкладна 20 працэнтаў маладых людзей пакідаюць экзаменацыйныя аўдыторыі на працягу першых 30 хвілін. І якія ў іх могуць быць балы?

Мікалай Фяськоў расказаў, што летась пасля аналізу вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання і ўсіх трох этапаў рэпетыцыйнага тэсціравання, у якіх бралі ўдзел абітурыенты Гродзеншчыны, высветлілася, што абітурыенты, якія ўдзельнічалі ва ўсіх трох этапах рэпетыцыйнага тэсціравання, паказалі на цэнтралізаваным тэсціраванні ў два разы вышэйшы бал, чым сярэдні па прадмеце сярод усіх удзельнікаў ЦТ. Тыя, хто ўдзельнічаў у двух этапах, атрымалі ў паўтара раза вышэйшы за сярэдні бал.

Самалюбства ўладальнікаў школьных «васьмёрак» і «дзявятак», якія аказваюцца ў ніжняй частцы 100-бальнай тэставай шкалы, моцна церпіць, як і прафесійнае самалюбства іх педагогаў. Некаторыя нават падазраюць арганізатараў у тэхнічных збоях пры праверцы работ удзельнікаў ЦТ.

А ўдзельнікі аднаго этапу рэпетыцыйнага тэсціравання паказалі сярэдні вынік.

— Рэпетыцыйнае тэсціраванне праводзіцца для таго, каб абітурыент мог атрымаць аб'ектыўную ацэнку сваёй гатоўнасці да ЦТ і набыць тэхнічныя навыкі па запаўненні бланка адказаў. І ў вялікай ступені яго вынік на ЦТ будзе залежаць ад таго, як ён зможа распарадзіцца атрыманай інфармацыяй, — тлумачыць Мікалай Фяськоў. — І пасля першага, і пасля другога, і нават пасля трэцяга раўнда ў абітурыента застаецца час, каб ліквідаваць прабелы ў ведах, якія былі выяўленыя падчас «рэпетыцыі».

У кастрычніку ў краіне стартуе першы раўнд рэпетыцыйнага тэсціравання. Ён, як правіла, прыцягвае меншую ўвагу з боку маладых людзей, чым другі і тым больш трэці раўнды. І вельмі дарэмна. Калі адсутнасці цікаўнасці з боку адзінаццацікласнікаў яшчэ можна знайсці тлумачэнне (не па ўсіх дысцыплінах да канца пройдзеная ўся школьная праграма), то нежаданне выпускнікоў папярэдніх гадоў патрэніравацца лішні раз зразумець немагчыма. У паспяховага ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні ёсць шмат складнікаў. Адзін з іх — псіхалагічная загартоўка плюс уменне распарадзіцца адведзеным часам. Другі — адсутнасць страху перад запаўненнем бланка адказаў. Вельмі важна навучыцца загаддзя правільна ўносіць у клетачкі сімвалы хімічных элементаў, лічбавыя адказы ў выглядзе дробу, адзінкі вымярэння (градусы, працэнты, метры, тоны) і адмяняць няправільныя адказы. Усё гэта называецца тэхнічнымі навыкамі. Многія абітурыенты прызнаюцца, што на сапраўдным экзамене іх нярэдка проста «клініць» нават пры запаўненні вобласці рэгістрацыі бланка адказаў. Вось і з'яўляюцца памылкі ў імёнах, прозвішчах і пашпартных звестках абітурыентаў. Напрыклад, замест слова «Надежда» пішуць «Надежа», у прозвішчы «Віктаравіч» ці імені «Дзяніс» абітурыенты дапускаюць ажно тры памылкі! А ёсць абітурыенты, якія ўвогуле забываюць запоўніць у бланку вобласць рэгістрацыі. Такіх крыўдных сітуацый можна пазбегнуць. На тое і існуе рэпетыцыйнае тэсціраванне. Адэкватнасць самаацэнкі таксама адыгрывае немалаважную ролю пры паступленні.

Кошт удзелу ў рэпетыцыйным тэсціраванні не змяняецца ўжо некалькі год запар і складае 16 100 рублёў за адзін прадмет. Грошы можна ўнесці ў любым аддзяленні «Беларусбанка». Атрымальнік — УП «Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў», разліковы рахунак **№ 3632934510021, філіял № 529 «Белсувязь», код 720, УНП 190194148. Трэба мець на ўвазе, што Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў не нясе адказнасці за якасць і змест тэстаў для тэсціравання, якое праводзіцца іншымі, не ўказанымі ў пераліку, установамі**.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Увага! Шукаем маладых людзей...

...Неабыякавых. Цікаўных. Дапытлівых. Можна і далей сыпаць завочнымі кампліментамі, але мы будзем рады знаёмству нават з тымі хлопцамі і дзяўчатамі, якія не лічаць сябе нейкімі неардынарнымі асобамі. Галоўнае — у вас ёсць мара стаць журналістам. І чаму б вам не паспрабаваць зрабіць свае першыя матэрыялы для «Чырвонай змены» — моладзевага дадатку да газеты «Звязда»? Пра што пісаць? Пра сябе (як вы ставіцеся да школьнай формы, ці складана вучыцца ў выпускных класах, якой павінна быць ідэальная школа, дзе бавіце час пасля заняткаў), пра тых, хто побач (вы знаёмыя з цікавымі людзьмі, вы ведаеце, дзе і як тусіць моладзь, а можа ваш сябар — будучы алімпійскі чэмпіён), пра тое, што вас хвалюе (вы хочаце, каб гучала, жыла беларуская мова, змагаецеся супраць курэння, шукаеце шляхі вырашэння разнастайных праблем).

Чакаем вашых лістоў у «Клубе юнкораў» у рэдакцыі (па адрасе: 220013, Мінск, Б. Хмяльніцкага, 10-А, моладзевы дадатак да «Звязды» «Чырвоная змена» альбо на электронны адрас газеты). Лепшыя матэрыялы з'явяцца на старонках газеты (і, як сапраўдныя журналісты, вы атрымаеце ганарар). Толькі не забывайцеся пакідаць свае каардынаты, нумары тэлефонаў, па якіх можна будзе з вамі звязацца.

КАЛІ БЕЛАРУСКІЯ СТУДЭНТЫ БУДУЦЬ ЖЫЦЬ У ІНТЭРНАЦЕ?

АБЯЦАНАЕ месца ў інтэрнаце так і засталося толькі абяцаннем. Вось і прыходзіцца амаль праз месяц пасля пачатку навучальнага года бадзяцца па блізкіх ды знаёмых у чаканні запаветнага жылля. Пры гэтым бачыш, як цэлымі партыямі ў інтэрнат прыязджаюць засяляцца замежныя студэнты... Прычым прыязджаюць дагэтуль і будуць ехаць яшчэ да сярэдзіны кастрычніка, у той час, як месцы для беларускіх студэнтаў ужо цалкам размеркаваныя. Аб тым, хто сёння жыве ў інтэрнаце і калі будуць вырашаныя праблемы з засяленнем беларусаў, мы гутарылі з дырэктарам студэнцкага гарадка БДУ Міхаілам Барысавічам ЧАРАПЕННІКАВЫМ:

— Усяго ў БДУ маецца адзінаццаць інтэрнатаў. Адно для супрацоўнікаў, астатнія — для студэнтаў. Зараз два з іх зачыненыя на капітальны рамонт. На гэты момант у інтэрнатах пражывае трошкі больш за 6 тысяч чалавек. Гэта шэсцьдзесят адсоткаў агульнай колькасці тых, хто жадае атрымаць жыллё. Сярод іх прыкладна 1400 чалавек — замежныя студэнты. Апошніх таксама забяспечваем не на сто працэнтаў. Усяго навучаецца ў БДУ каля 1700 замежных студэнтаў. У першую чаргу цалкам засяляем першы курс.

— Чаму сярод студэнтаў-замежнікаў працэнт заселеных у інтэрнат большы, чым сярод беларускіх студэнтаў?

— На гэта ёсць дзве асноўныя прычыны. Першая з іх — рэгістрацыя на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Гэта прадугледжана Законам «Аб прававым становішчы замежных грамадзянах і асоб без грамадзянства ў РБ». Згодна з ім адрас рэгістрацыі павінен супадаць з адрасам пражывання. Калі беларускаму студэнту дастаткова зарэгістравацца па адрасе галоўнага навучальнага корпуса і не мець асобых праблем, то ў замежнікаў іншая сітуацыя. Знайсці жыллё — палова праблемы. Рэгістрацыя па месцы жыхарства — вось з чым узнікаюць цяжкасці. Вялікая колькасць тых, хто здае кватэры, людзі ва ўзросце. У іх паняцці, зарэгістраваць у сябе замежнага студэнта — значыць, падараваць яму частку кватэры. Развеяць гэтыя міфы вельмі цяжка.

Другая праблема — бяспечнасць. Першакурснікі, калі прыязджаюць на вучобу, жадаюць жыць у інтэрнаце, таму што лічаць гэта больш бяспечным. Акрамя таго, у іх ёсць моўная праблема. А вось студэнты 2—5 курсаў заселеныя на семдзесят адсоткаў.

Што тычыцца беларусаў, то ў інтэрнаце пражывае шэсцьдзесят сем працэнтаў студэнтаў першага курса. Менш забяспечаны жыллём 5 курс. Гэта свядомая пазіцыя ўніверсітэта, якой не першы год. На пятым курсе шмат студэнтаў пачынае шукаць працу, прапіску, месца жылля. Акрамя таго, у іх яшчэ дзве практыкі — пераддыпломная і дыпломная. Таму самымі безабароннымі ў гэтай сітуацыі з'яўляюцца першакурснікі. Тым не менш зразумела, што студэнты, якія маюць ільготы, на якім бы курсе яны ні былі, усё роўна будуць заселеныя.

— Што гэта за льготы?

— За апошнія два гады сістэма размеркавання месцаў у інтэрнаце амаль не змянілася. Па-за чаргой засяляюцца інваліды першай і другой групы, сіроты і «чарнобыльцы». У гэтым годзе да спіса дадалі яшчэ лаўрэатаў спецфонду Прэзідэнта, якія сапраўды заслугоўваюць такіх адносін: яны лепшыя з лепшых. Пасля гэтай групы льготнікаў ідуць студэнты са шматдзетных ці няпоўных сем'яў, інваліды трэцяй групы. У канцы спіса тых, хто мае права на жыллёвую плошчу, — універсітэцкі актыў: спартсмены, алімпіяднікі, будаўнічыя атрады. Паказчыкам пры засяленні выступае таксама сярэдні бал студэнта. Залежыць ён ад колькасці льготнікаў і агульнай паспяховасці факультэта. Звычайна, каб прэтэндаваць на месца, трэба мець на паўтара бала вышэй за агульную факультэцкую паспяховасць.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

ПАРАДЫ АД ПЕРШАКУРСНІКАЎ

Вам слова!

У гэтым годзе я стала студэнткай першага курса Інстытута парламентарызму і прадпрымальніцтва, вучуся на журналіста. Прайшоў першы месяц у студэнцкім жыцці. Уражанняў вельмі шмат. А як жывецца маім калегам, якія таксама яшчэ зусім нядаўна карпелі над разнастайнымі дапаможнікамі і рыхтаваліся да паступлення? Можа, у іх ёсць парады для абітурыентаў-2011?

Ілья Сучкоў, Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія:

— Скончыўшы Ільянскі дзяржаўны аграрны каледж, вырашыў не спыняцца на дасягнутым і паступіў у ВНУ. Я ўпэўнены, што абраная прафесія аграэколага — гэта мой шлях, таму ў вучэбны працэс уліваюся лёгка, і вучоба прыносіць толькі пазітыў.

Сённяшнім абітурыентам параю перш за ўсё ўзважыць усе плюсы і мінусы будучай прафесіі, добра абдумаць свой выбар. І толькі тады рыхтавацца да паступлення і аддаць усе сілы на тое, каб набраць добры бал. І наперад!

Аксана Ельяшэвіч, Інстытут журналістыкі БДУ:

— Не адкладайце ўсё на апошні момант! Не эканомце на рэпетытарах, але без фанатызму! Цяпер, ужо студэнткай, я магу вас у гэтым упэўніць. Пры падрыхтоўцы да паступлення велізарную падтрымку аказалі падрыхтоўчыя курсы БДУ па журналістыцы. Ну і, вядома, вялікі дзякуй рэдакцыі «Рэгіянальнай газеты», у якой я працавала да паступлення ў сваім родным горадзе Маладзечна. У нашым інстытуце пануе творчая атмасфера, побач са мной таленавітыя людзі. Хоць нагрузка большая, чым у школе, затое я займаюся тым, што мне цікава. І не губляю марна час на прадметы, якія мне не патрэбныя.

Марына Валошына і Вольга Юркевіч, аднагрупніцы Інстытута парламентарызму і прадпрымальніцтва:

— У гэтым інстытуце нам падабаецца нестандартны падыход да вучэбнага працэсу — тут выдатныя выкладчыкі, цікавыя дысцыпліны. З аднагрупнікамі склаліся цёплыя адносіны — згадзіцеся, у наш час такое адбываецца не часта. І галоўнае зараз для ўсіх нас — жаданне спасцігнуць глыбіні абранай прафесіі і развівацца гарманічна і ўсебакова. Менавіта гэтыя якасці так неабходныя для будучых журналістаў.

Таццяна Шкет, БДУ, факультэт філасофіі і сацыяльных навук:

— Будучую прафесію выбірайце загадзя. Безумоўна, абітурыент ўжо сёння павінен ведаць, менавіта чаго жадае і чаго чакае ад будучай прафесіі. Калі выбірала свой далейшы шлях, слухала сваё сэрца, але і кіравалася парадамі бацькоў.

Адзінаццаты клас быў складаным для мяне, бо добра рыхтавалася ўвесь год, узмоцнена працавала над атэстатам, хадзіла да рэпетытараў. Проста паставіла перад сабой мэту і няўхільна ішла да яе. І віншуйце мяне — я студэнтка-першакурсніца!

Вольга Цярэшка, Віцебская дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны:

— Усё жыццё марыла аб прафесіі ветэрынара — з маленства люблю сабак і нават колькі гадоў таму, яшчэ школьніцай, адчыніла ў Маладзечне гадавальнік «The Best friends». Зараз мае гадаванцы вядомыя не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі — у Германіі, Расіі, Польшчы...

Са студэнцкім жыццём я пазнаёмілася, калі вучылася ў аграрным каледжы, таму асаблівай розніцы не адчуваю — адзінае, нагрузкі больш.

Я сама ніколі не займалася з рэпетытарамі і не наведвала падрыхтоўчых курсаў — мне здаецца, гэта не ключавы момант. Але ўсё індывідуальна і свой далейшы лёс будаваць вам.

Таццяна БАЖКО, студэнтка Інстытута парламентарызму і прадпрымальніцтва.

ПАДАРЫ ЎСМЕШКУ ДЗЕЦЯМ

Курсанты Інстытута памежнай службы — актывісты Першамайскага райкама БРСМ — вырашылі падарыць дзецям з сацыяльна-педагагічнага цэнтра з прыютам свята. Але свята незвычайнае, спартыўнае, у якім маглі б прымаць удзел як пяцігадовыя хлопчыкі і дзяўчынкі, так і 16-гадовыя юнакі. Актывісты вырашылі не проста перадаць сабраныя валанцёрскім атрадам рэчы, цацкі, канцылярскія тавары, але і падарыць дзецям незабыўныя імгненні добрага настрою. Малыя бегалі, скакалі, гулялі, малявалі, выконвалі розныя заданні. І ўсё, безумоўна, пад чуткім кіраўніцтвам маладых памежнікаў. Сапраўдным жа падарункам для валанцёраў сталі дзіцячыя ўсмешкі за незабыўнае свята.

Юлія ЯКУНІНА.